ПАДЗЕЯ




# ПАДАРУНАК ДЛЯ МУЗЕЯ – НОВАЯ КНІГА

**СМАРГОНЬ. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі, публіцыст, краязнаўца Галіна АНТОНАВА ўзяла ўдзел у святкаванні юбілею Установы культуры “Смаргонскі гісторыка-краязнаўчы музей”.**

Смаргонскі гісторыка-краязнаўчы музей адзначыў сваё 40-годдзе. Сярод ганаровых гасцей на ўрачыстай імпрэзе пабывала член Саюза пісьменнікаў Беларусі, публіцыст, краязнаўца, журналіст раённай газеты “Светлы шлях” Галіна Антонава.

Галіна Францішкаўна – даўні сябра музея. Яна не толькі пастаянна асвятляе на старонках газеты і ў сеціве мерапрыемствы, што ладзяцца ў гэтай установе, але і актыўна удзельнічае ў іх. Менавіта тут у снежні 2019 годзе яна прэзентавала свой праект пра  вядомага смаргонца Аляксандра Дзяругу (музыку, педагога, фатографа). Пазней цыкл газетных матэрыялаў стаў асновай для кнігі “Дзяруга”.

У сакавіку 2021 года смаргонская пісьменніца прапанавала для выставы “Маляваныя дываны Ніны Бохан” рэчы з асабістай калекцыі, а таксама расказвала падчас адкрыцця выставы пра творчасць і трагічны лёс інсітнай мастачкі. Галіна Антонава  збірала гэту інфармацыю на працягу двух гадоў.

На выставе “Смаргонскія найгрышы – нематэрыяльная культурная спадчына Беларусі” ў сакавіку 2023 года публіцыстка распавяла пра жыццёвы і творчы лёс самадзейных музыкаў Смаргоншчыны. У 2019 і 2020 гадах на старонках газеты “Светлы шлях” (у праекце “З крыніц народных, жыватворных”) былі

надрукаваны каля дзясятка нарысаў пра музыкаў. Публікацыі пазней былі сабраны пад адну вокладку – у выніку выйшла кніга Галіны Антонавай “Самародкі”.

Усе выданні смаргонскага аўтара захоўваюцца ў фондах музея. Падчас юбілейнай імпрэзы Галіна Антонава ўручыла дырэктару ўстановы Дзіне Валодзька сваю новую кнігу “Знайсці сябе”.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** публіцыст, краязнаўца, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Галіна АНТОНАВА на святкаванні 40-годдзя Смаргонскага гісторыка-краязнаўчага музея. Смаргонь, снежань 2024 года. (*Фота: Дзмітрый Ярмак*).











ЗНАЙСЦІ СЯБЕ





